View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 341.322.6

# РЭПРЭСІІ БЕЛАРУСКІХ ВУЧОНЫХ У ГАДЫ СТАЛІНІЗМУ

***Ю.А. Скабец**, 1 курс*
*Навуковы кіраўнік – **Л. П. Місюкавец**, выкладчык*
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт*

Эпоха сталінізму ў СССР, ахапіўшая другую палову 20-х – першую палову 50-х гадоў, мела супярэчлівы характар. Вялікі працоўны энтузіязм народа і яго вера ў Сталіна спалучаліся з умацаваннем таталітарнай сістэмы, зніжэннем кошту чалавечага жыцця, масавымі парушэннямі правоў чалавека, укараненнем у грамадскім жыцці думкі аб непаграшымасці і беспамылковасці прадстаўнікоў вышэйшай партыйнай і дзяржаўнай улады, няведаннем ці нежаданнем ведаць, што натхняльнікам масавых палітычных рэпрэсій з'яўляецца менавіта Сталін [2. с.48-52].

Рэпрэсіі ў БССР – неабгрунтаванае прыцягненне да крымінальнай адказнасьці за дзяржаўныя (г.зв. «контррэвалюцыйныя») злачынствы, а таксама высылка — накіраванне на спецпасяленні за межы БССР судовымі або пазасудовымі органамі па палітычных, сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных і іншых матывах. Пачаліся ў 1917 годзе, сістэматычны характар набылі ў 1930 годзе, найбольшы размах мелі ў 1937–1938 гадах, спыніліся разам са смерцю Сталіна ў 1953 годзе [1, с. 53-55].

Дакладную лічбу рэпрэсаваных, як і падрабязныя сведчанні савецкіх злачынстваў, у наш час высветліць немагчыма з тае прычыны, што архівы КДБ дагэтуль закрытыя для даследнікаў.

Паводле няпоўных падлікаў (многія дакументы не захаваліся) ахвярамі палітычных рэпрэсій у Беларусі ў 1917–1953 гг. сталі каля 600 тысяч чалавек, з іх 250 тысяч асуджаныя судовымі ці пакараныя рашэннямі пазасудовых органаў («двоек», «троек», асобых нарадаў, калегіяў АДПУ, НКУС, Міністэрства дзяржаўнай бяспекі (МДБ)). У 1917–1953гг. да найвышэйшай меры пакарання (расстрэлу) прысуджаныя 358 686 чалавек.

Усяго з 1954 да пачатку 2000 года ў Беларусі рэабілітавана больш за 200 тыс. ахвяраў палітычных рэпрэсіяў [4, с. 344].

У 1930-я савецкія ўлады фізічна і духоўна знішчылі 32 мінскіх гісторыкаў, іх працы выдалены з навуковых бібліятэк. Увогуле, была поўнасцю знішчана беларуская гістарычная школа.

З 540—570 літаратараў, якія друкаваліся ў Беларусі ў 1920—1930-я гады

ХХ стагоддзя было рэпрэсіравана не менш за 440—460 (80%), у тым ліку Тодар Кляшторны, Андрэй Мрый ды мноства іншых вядомых аўтараў. Калі ўлічваць аўтараў, вымушаных з’ехаць з радзімы, то рэпрэсіям падвергліся не менш за 500 (90%), чвэртка Ўсёй колькасьці літаратараў (2000), рэпрэсаваных у СССР.

Тым часам, паводле падлікаў У. Маракова, ва Украіне колькасць рэпрэсаваных літаратараў склала каля 35-40%, у Расіі – не больш за 15%

[4, с. 196-201].

У канцы 20-х гадоў у БССР пачынаецца знішчэнне нацыянальнай інтэлігенцыі, якую абвінавачваюць у правым ухіле і «нацыянал-дэмакратызме», іншымі словамі, у прапагандзе варожай ідэалогіі і жаданні «рэстаўрацыі і капіталізму» на беларускай зямлі. Супраць беларускай культурнай эліты, абазванай «нацдэмамі», фабрыкуецца справа аб быццам бы створанай ёй антысавец-



Полесгу

кай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ). У 1931 годзе за прыналежнасць да СВБ было арыштавана 108 і асуджана 90 чалавек, сярод якіх вядомыя палітычныя і культурныя дзеячы Зм. Жылуновіч, У. Ігнатоўскі,

Дз. Прышчэпаў, А. Баліцкі, В. Ластоўскі, П. Ільючонак і інш. Падчас следства, у лістападзе 1930 года, спробу самагубства здзейсніў Янка Купала, якому адводзілася роля кіраўніка СВБ, напісаўшы ў перадсмяротным лісце, што «лепш смерць фізічная, чым палітычная» [3, с. 25-67].

У 30-я гады ў выніку рэпрэсій Саюз пісьменнікаў Беларусі страціў больш паловы сваіх членаў. Яшчэ большыя страты панесла Акадэмія навук Беларусі, дзе сярод рэпрэсіраваных аказаліся 26 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў. З 139 аспірантаў, якія былі ў 1934годзе, засталося толькі шэсць чалавек. Так, шостага снежня 1930 года СНК БССР прыняў пастанову аб выключанні са складу БАН першых акадэмікаў: Г.І. Гарэцкага, А.Д. Дубаха, В.У. Ластоўскага,

І.Ю. Лёсіка, С.М. Некрашэвіча.УІ. Пічэты, якія ў гэты час яшчэ знаходзіліся пад следствам.

У 1937-1938 гг. беларуская інтэлектуальная эліта панесла велізарныя страты. Па неабгрунтаваных абвінавачваннях былі рэпрэсіраваны вядомыя дзеячы навукі і культуры, арганізатары навукі, у тым ліку акадэмікі: Я.М. Афанасьеў, Ц.Л. Бурстын, П.В. Горын, Т.Ф. Домбаль, І.І. Замоцін, Дз.Ф. Жылуновіч,

С.Ю. Матулайціс, П.Я. Панкевіч, І.А. Пятровіч, В.А. Сербента, І.З. Сурта,

Б.А. Тарашкевіч, В.К. Шчарбакоў.

За гады рэпрэсій ахвярамі сталі больш за 140 вучоных і супрацоўнікаў Беларускай акадэміі навук (з 1936 г. Акадэмія навук БССР), прычым многія былі прыгавораны да вышэйшай меры пакарання [8, с. 89].

Даследаванні ў галіне гуманітарных навук практычна спыніліся. З верасня 1939 года рэпрэсіі актыўна праводзіліся ў Заходняй Беларусі, далучанай да БССР.

Месцы масавых растрэлаў асуджаных на смерць, якія існавалі ва ўсіх кутках Беларусі, старанна хаваліся. Сярод такіх месцаў шырокую вядомасць набылі Курапаты, што пад Мінскам. Там у 30-я гады было растраляна каля 30 тыс. чалавек. Недалёка ад Гомеля па Чарнігаўскай шашы таксама знаходзіцца месца масавых растрэлаў эпохі сталінізму [6, с. 27].

У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў сутарэннях мінскай унутранай турмы НКВД – «амерыканкі» – былі расстраляныя больш за сто прадстаўнікоў беларускай інтэлектуальнай эліты – знакімітых дзеячаў культуры, мастацтва і навукі, а таксама грамадскіх дзеячаў тагачаснай БССР.

На развіцці акадэмічнай навукі, як і ўсяго савецкага грамадства, негатыўна адбіліся рэпрэсіі 1930-х гг. Праблема абвастралася тым, што беларуская акадэмічнае асяроддзе было вынішчана на этапе яго станаўлення, калі толькі пачалі фарміравацца навуковыя школы.

Толькі дзякуючы прыроднаму інтэлектуальна-генетычнаму таленту беларускага народа, яго празе да ведаў з вялікімі цяжкасцямі папаўняліся тыя велізарныя страты, якія былі нанесены навуковым кадрам у трагічныя гады рэпрэсій. У сярэдзіне 50-х былі спынены масавыя рэпрэсіі, пачала ажыццяўляцца рэабілітацыя (аднаўленне добрага імя) бязвінна асуджаных. Было рэабілітавана каля 40 тысяч жыхароў рэспублікі [2, с. 308].

Вялікая праца праводзіцца па перавыданні твораў рэпрэсіраваных навукоўцаў. Адноўлены ў памяці народа імёны выдатных беларускіх вучоных гісторыкаў У. Ігнатоўскага, пяру якога належыць "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі", В. Ластоўскага, які яшчэ ў 1910 г. надрукаваў упершыню на беларускай мове "Кароткую гісторыю Беларусі", Б. Тарашкевіча "Граматыка для школ" і інш.

Трагічным вынікам масавых рэпрэсій у БССР з'яўляецца практычна поўнае знішчэнне дарэвалюцыйнай інтэлігенцыі і значнай часткі новай, савецкай, падрыхтаванай у 20-30-я гады вышэйшымі вучэбнымі ўстановамі рэспублікі. Рэпрэсіі знішчылі эліту беларускай нацыі, яе інтэлектуальны патэнцыял. Масавы тэрор супраць інтэлігенцыі абярнуўся спыненнем нацыянальна – культурнага будаўніцтва, навуковых даследаванняў, вытворчых распрацовак. Была прыпынена сувязь пакаленняў, страчаны многія духоўныя каштоўнасці,падаўлена нацыянальная самасвядомасць народа. Стала некаму абараняць нацыянальныя ідэі, а тым больш праводзіць іх у жыццё. Зразумела, што гэта ўсё садзейнічала русіфікацыі беларусаў.

На пачатку 2009 года ЮНЕСКА аднесла мову беларусаў да моў, якія апынуліся пад пагрозай поўнага знікнення.

Мне б хацелася, каб кожны з беларусаў успомніў пра рэпрэсіраваных, якія аддалі жыццё за адстойванне нашай мовы, культуры, традыцый. Бо яны хацелі, каб будучыя пакаленні ведалі свае карані. Наша родная мова яшчэ не згублена, бо захоўваюцца яе карані ў народзе, яшчэ жывая, так



ПолесГУ

бы мовіць, грыбніца, гатовая прыняць шчыры клопат і ласку ад дзяржавы, каб адрадзіцца, ачысціцца і пайсці ў рост, мы павінны змяніць свае адносіны да мовы.

ПолесГУ

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Врублевский А.П., Протько Т.С. Из истории репресий против белорусского крестьянства. 1929 – 1934 гг. Мн., 1992. – с. 219.

2. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый). Вучэбн. Дапаможнік / В. І. Галубовіч, З. В. Шыбека, Д. М. Чаркасаў і інш.; Пад рэд. В. І. Галубовіча і Ю. М. Бохана. — Мн.: Экаперспектыва, 2005.— 584 с. ISBN 985-469-120-9.

3. Маракоў, Л. Ахвяры і карнікі. Мінск: Зміцер Колас, 2007 г. ISBN 978—985-6783-38-6.

4. Маракоў, Л.У. Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна-і царкоўнаслужыцелі Беларусі 1917—1967: Энцыклапедычны даведнік: У 2 т. Т. 1. — Мн:, 2007.

5. Платонаў, Р. „Шпіёны“ з Акадэміі навук // Беларуская мінуўшчына. 1996. № 4.

6. Тарновский, Г., Соболев В., Горелик Е. Куропаты: следствие продолжается. М., 1990.- с.165.

ПолесГУ